решения вопроса государственной принадлежности Полесья (автономия в составе Беларуси или Украины, независимое государство и др.). В заключении письма авторы выражали надежду, что изучение особенностей различных регионов будет содействовать не возникновению сепаратистских настроений, а консолидации белорусской нации [4, с. 4].

Таким образом, на основе анализа представленных документов можно сделать вывод, что большинство представителей белорусского академического сообщества относилось к западнополесскому движению негативно или скептически: отмечало его псевдонаучный характер, видело в нем угрозу национальной целостности Беларуси.


1. *Дынько, А.* Пра заходнепалесскі (яцвяжскі) нацыятворчы праект у 1980–1990-х гадах / А. Дынько // Загароддзе-3 : матэрыялы навук.-краязнаўч. канф. «Палессе ў XX ст.», Беласток, 1–4 чэрв. 2000 г. / уклад. і агул. рэд. Ф. Д. Клімчука, А. Энгелькінг, В. А. Лабачэўскай. – Мінск, 2001. – С. 29–35.

2. *Казак, О. Г.* Русинское этнополитическое движение в современной Украине / О. Г. Казак // Вестн. Белорус. гос. эконом. ун-та : научн.-практ. журн. – 2021. – № 4. – С. 105–112.

3. Личное дело аспиранта-очника Н. Н. Шеляговича // ЦНА НАНБ. – Ф. 2. Оп. 1. Д. 20471. Л. 1–56.

4. *Лысенка, П.* Пазіцыі і амбіцыі Міколы Шаляговіча і яго паплечнікаў. Аб нацыянальнай прыналежнасці Заходняга Палесся і пазіцыях кіраўнікоў аб'яднання «Полісьсе» / П. Лысенка, У. Палуян // Заря. – 1992. – 16 июля. – С. 3–4.

5. Протокол заседания Ученого совета Института языкознания АН БССР, 27 июня 1986 г. // ЦНА НАНБ. – Ф. 8. Оп. 1. Д. 383. Л. 63–74.

6. Протокол заседания Ученого совета Института языкознания АН БССР, 5 февраля 1990 г. // ЦНА НАНБ. – Ф. 8. Оп. 1. Д. 406. Л. 14–18.

7. Протокол заседания Ученого совета Института истории АН Беларуси, 3 марта 1992 г. // ЦНА НАНБ. – Ф. 3. Оп. 1. Д. 962. Л. 26–32.


УДК:793.4/7.079:379.8-053.2

# ФЕСТЫВАЛЬ ГУЛЬНІ ЯК ФОРМА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ГУЛЬНЯВОГА ЖАНРУ

***Л. І. Казлоўская,*** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя**. У артыкуле прадстаўлена педагагічная ацэнка дзіцячага фестывалю гульнявых праграм «Гуляюць дзеці – гуляем мы!». Адзначаецца, што фестываль мае сваю гісторыю; паказаны задачы фестывалю, накіраваныя на развіццё дзіцячай творчасці, крытэрыі ацэнкі якасці правядзення гульнявых праграм: па вобласці дзейнасці, характары педагагічнага працэсу, гульнявой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

методыцы, прадметнай вобласці, гульнявым асяроддзі. Сцвярджаецца, што ў кожнай педагагічна пабудаванай гульні ёсць перш за ўсё працоўныя высілкі і намаганне думкі. Гульня дастаўляе і дзіцяці, і даросламу радасць – радасць перамогі, радасць творчасці, эстэтычную асалоду. Гульня – гэта заўсёды негвалтоўная актыўнасць, якая ў далейшым уплывае на якасць працы.

**Ключавыя словы:** гульня, фестываль, дзеці, Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня», адукацыйная дзейнасць.

## GAME FESTIVAL AS A FORM OF POPULARIZATION OF THE GAME GENRE

***L. Kozlovskaya,*** *PhD in Pedagogical Sciences, Associate Professor, Professor of the Department of Pedagogy and Sociocultural Activity of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article presents a pedagogical assessment of the children's festival of game programs «Children are playing – we are playing!». It is noted that the festival has its own history, shows the tasks of the festival aimed at the development of children's creativity, the criteria for assessing the quality of the game programs: by field of activity, by the nature of the pedagogical process, by the game methodology, by the subject area, by the game environment. The author takes the position that in every pedagogically structured game there is, first of all, a working effort and an effort of thought. The game gives both the child and the adult joy – the joy of victory, the joy of creativity, aesthetic pleasure. Play is always a nonviolent activity that further affects the quality of work.

**Keywords:** game, festival, children, National Children's Educational and Health Center «Zubrenok», leisure activities.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу дзесяці гадоў на базе Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня» праходзілі міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі гульнявых праграм «Гуляюць дзеці – гуляем мы!», арганізаваныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і цэнтрам «Зубраня». Фестываль – масавае свята, паказ і агляд лепшых дасягненняў мастацтва: музычнага, тэатральнага, спартыўнага, кіно і г. д.

Сузаснавальнікам фестывалю з'яўляецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, яго выкладчыкі былі старшынямі фестывалю гульні, уваходзілі ў склад журы. Фестываль арганізаваны з мэтай стварэння ўмоў для павышэння ўзроўню педагагічнага майстэрства, выяўлення і распаўсюджвання лепшага вопыту работы педагогаў у арганізацыі гульнявой дзейнасці дзяцей і моладзі.

Задачамі фестывалю з'яўляюцца: пошук і распрацоўка інавацыйных форм работы з дзецьмі, удасканаленне педагагічнай тэхнікі ў сферы правядзення гульнявых праектаў, стымуляванне ініцыятывы і творчасці педагогаў, культарганізатараў, прывіццё цікавасці да самаадукацыі, арганізацыя працы па абмене вопытам, пашырэнне творчага дыяпазону педагогаў і культарганізатараў.

Фестываль (ад лац. *festivus* – «святочны») – масавае свята, паказ (агляд) дасягненняў музычнага, тэатральнага, эстраднага, цыркавога або кінамастацтва. Фестывалі бываюць сусветныя, міжнародныя, рэспубліканскія, абласныя і раённыя [2]. На працягу многіх гадоў у розных кутках Беларусі праходзяць цікавыя фестывалі: знакамітыя музычныя і тэатральныя форумы, фестывалі народнай культуры, старадаўніх рамёстваў і нацыянальнай кухні, велікасвецкія балі, рыцарскія турніры і рэканструкцыі эпохі Сярэдневякоўя, незвычайныя экалагічныя святы [1].

Фестывальны рух, які выклікае зацікаўленасць аматараў разнастайнасцю форм і метадаў, рэалізуецца ў сюжэтна-гульнявых, конкурснa-забаўляльных, інтэлектуальна-пазнавальных, фальклорных гульнявых праграмах і ўяўляе сабой педагагічнае асяроддзе маральнага, эстэтычнага і патрыятычнага выхавання. Фестывалі дзяцей і моладзі – масавае свята, паказ (агляд) дасягненняў гульнявой творчасці, у якой ствараюцца ўмовы для творчай самарэалізацыі дзяцей і моладзі.

Міжнародны фестываль і конкурс гульнявых праграм «Гуляюць дзеці – гуляем мы!» найбольш эфектыўны па ўключэнні дзяцей у культурна-дасугавую дзейнасць, павышэнні наведвальнасці ўстаноў дадатковай адукацыі, а папярэдняе правядзенне конкурсаў у розных рэгіёнах краіны робіць даступным удзел у іх творчых калектываў з самых аддаленых населеных пунктаў.

Арганізатары фестывалю распрацавалі наступныя крытэрыі ацэнкі якасці правядзення гульнявых праграм:

– актуальнасць заяўленай тэмы;

– арыгінальнасць сцэнарнай ідэі;

– кампазіцыйнае рашэнне гульнявога праекта (сцэнарна-рэжысёрскі ход, музычнае і мастацкае афармленне гульнявой праграмы, выкарыстанне разнастайных прыёмаў тэатралізацыі);

– якаснае і дасканалае выкарыстанне сродкаў мастацкай выразнасці (святло, касцюмы, рэквізіты, дэкарацыі і г. д.);

– майстэрства і артыстычнасць выканання (культура мовы, уменне трымацца на сцэне, уменне імправізаваць, даступнае тлумачэнне гульнявых правілаў і ўмоў і г. д.);

– праца з гледачамі, эфектыўнае ўцягванне іх у сюжэтна-гульнявое дзеянне.

За дзесяць гадоў правядзення конкурсу былі прадстаўлены самыя разнастайныя па відах гульнявыя праграмы: спартыўна-аздараўленчыя, конкурсна-гульнявыя, інтэлектуальна-пазнавальныя, фальклорныя, карэкцыйна-прафілактычныя і інш. Варта адзначыць, што многія гульнявыя праграмы адрозніваліся разнастайнасцю зместу і форм гульні. Змест многіх праграм быў накіраваны на прапаганду здаровага ладу жыцця, прыцягненне дзяцей і моладзі да фізкультуры і спорту, вывучэнне гісторыі роднага краю, літаратуры і мастацтва, народных традыцый. Конкурсы і гульні ў прадстаўленых гульнявых праграмах адрозніваліся даступ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насцю, выдумкай, арыгінальнымі гульнявымі дзеяннямі, давалі магчымасць дзецям праявіць вынаходлівасць, ініцыятыву, творчасць.

Сярод формаў гульні былі прадстаўлены:

– гульні па вобласці дзейнасці: фізічныя, інтэлектуальныя, працоўныя, псіхалагічныя;

– па характары педагагічнага працэсу: абагульняючыя, навучальныя, пазнавальныя, выхаваўчыя, развіццёвыя, рэпрадуктыўныя, творчыя, камунікатыўныя;

– па гульнявой методыцы: прадметныя, сюжэтныя, ролевыя, імітацыйныя, спаборніцкія, драматызацыі;

– па прадметнай вобласці: матэматычныя, экалагічныя, фізічныя, мастацтвазнаўчыя, музычныя, літаратурныя, народныя, турыстычныя, кіраўніцкія, педагагічныя;

– па гульнявым асяроддзі: з прадметамі і без, прасторава-часавыя.

Ува многіх праграмах культарганізатары выкарыстоўвалі метад ілюстрацыі і тэатралізацыі. У якасці вядучых гульнявых праграм выступалі персаніфікаваныя вобразы: казачныя героі, героі літаратурных твораў, вясёлыя клоўны, турысты-экскурсаводы, кветачніцы, Несцерка, Паўлінка, Лявоніха, што давала магчымасць удзельнікам гульні хутка ўключацца ў гульнявы працэс.

Так, напрыклад, гульнявая праграма «Сярод шумнага балю», падрыхтаваная культарганізатарамі цэнтра «Зубраня», дазволіла яе ўдзельнікам пазнаёміцца з гісторыяй баляў, прыняць удзел у танцах і конкурсах, якія праводзяцца на балях.

Варта адзначыць гульнявую праграму «Эстафета добрых спраў», падрыхтаваную культарганізатарамі Палаца дзіцячай творчасці Петраградскага раёна г. Санкт-Пецярбурга. Яе мэта – прапаганда здаровага ладу жыцця. Праграму адрознівала драматургічная распрацоўка зместу, заснаваная на сінтэзе выразных сродкаў, высокае выканальніцкае майстэрства праграмы, прыёмы актывізацыі аўдыторыі.

Прафесійнае вядзенне гульні, якаснае выканальніцкае майстэрства і прыёмы працы з аўдыторыяй прадэманстравалі і студэнты кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія за дзесяць гадоў існавання фестывалю прадставілі больш за дваццаць аўтарскіх сюжэтна-гульнявых праграм, конкурсаў, адзначаных дыпломамі.

Многія культарганізатары выкарыстоўвалі ў гульнявых праграмах разнастайнасць выразных сродкаў: аўдыа- і відэаматэрыялы, арыгінальнае афармленне гульнявой пляцоўкі, музычнае суправаджэнне, што надавала гульнявому працэсу арыгінальнасць, эмацыянальнасць, відовішчнасць.

Варта адзначыць, што ў праграме конкурсу значна павялічылася колькасць фальклорных праграм, якія з'яўляюцца найважнейшай крыніцай прапаганды народных мастацкіх традыцый. Фальклорныя гульнявыя праграмы прысвечаны каляндарна-святочным падзеям (Мас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

леніца, Купалле, Каляды і інш.), у іх сюжэт уводзяцца персаніфікаваныя вобразы, напрыклад, Несцерка, Лявоніха, Купалінка, што надае ім асаблівую відовішчнасць; яны ўключаюць магутны пласт самабытнага народнага мастацтва. Народныя гульні як кампанент фальклорных гульнявых праграм з'яўляюцца своеасаблівым помнікам гісторыі культуры. Яны арганічна спалучаюць у сабе словы, рухі, песні, народныя мелодыі. Змест гульняў лёгка засвойваецца, а прастата і варыятыўнасць правілаў, маляўнічасць рэквізіту робяць іх даступнымі для правядзення ў самых разнастайных умовах. Напрыклад, «Палескія пастушкі», «Слуцкія паясы», «Падушачка», «Чарадзей», «Жаніцьба Цярэшкі», «У карагодзе мы былі», «Яшчур» і інш. Большасць з іх прывабныя тым, што яны сюжэтная, дазваляюць вобразна прайграваць моманты працы, палявання, інтэрпрэтаваць па-свойму найбагацейшы народны фальклор. Яны дазваляюць звязаць мінулае з сённяшнім, паказаць адказнасць маладога пакалення за захаванне і працяг лепшых традыцый нашага народа.

На працягу дзесяці гадоў арганізатары фестывалю таксама прадугледжваюць правядзенне майстар-класаў, семінараў, круглых сталоў, сустрэч з лаўрэатамі міжнародных конкурсаў гульні, што дазваляе ўдзельнікам даведацца шмат новага пра перспектывы развіцця гульнявога жанру.

У 2021 г. па выніках фестывалю быў праведзены падрабязны аналіз якасці працы культарганізатараў па арганізацыі і правядзенні гульнявых праграм. Звярталася ўвага на ўменне:

– самастойна мадэляваць гульнявыя сітуацыі на аснове вядомых гульнявых форм;

– выступаць у ролі арганізатара і вядучага гульні ў залежнасці ад узросту ўдзельнікаў;

– прагназаваць педагагічны вынік гульнявога дзеяння;

– драматургічна змадэляваць цэласную гульнявую праграму на аснове пэўнай зададзенай тэмы і г. д.

Па выніках праведзеных фестываляў Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня» выдаў зборнік сцэнарыяў гульнявых праграм культарганізатараў Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана.

У аўтара артыкула як старшыні журы дадзенага фестывалю ёсць некаторыя прапановы па паляпшэнні якасці арганізацыі і правядзення гульнявых праграм, прадстаўленых на конкурс:

– распрацаваць больш праграм, разлічаных на старэйшых школьнікаў;

– звярнуць асаблівую ўвагу на інтэлектуальна-пазнавальныя праграмы, якія на конкурсе прадстаўлены ў нязначнай колькасці;

– звярнуць увагу на культуру мовы вядучых, тэкст вядучага павінен быць лаканічным, але інфармацыйна ёмістым, а таксама ўтрымліваць аб'яву назвы кожнага конкурсу гульні, абгрунтаванне конкурснай задачы і ўмовы яе выканання, невялікі каментарый пасля заканчэння конкурсу;

– важна ўсвядоміць, што відовішчнасць ў гульнявых праграмах дасягаецца не толькі сцэнічнымі эфектамі (святлом, музыкай, мастацка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэкаратыўнымі элементамі, хоць яны, бясспрэчна, важныя), але ў першую чаргу цікавым рашэннем конкурснага дзеяння (спаборніцтва), якое ад пачатку да канца адбываецца на вачах у гледача і дазваляе яму з неаслабнай увагай сачыць за ходам «барацьбы»;

– звярнуць увагу на прагназаванне культарганізатарамі педагагічнага выніка гульні;

– працягласць праграмы не павінна перавышаць 20 хвілін.

Гэтыя рэкамендацыі дапамогуць культарганізатарам у падрыхтоўцы новых гульнявых праектаў.


*1. Наумчик, В. Н.* Социально-культурная деятельность : словарь / В. Н. Наумчик, М. А. Паздников, О. В. Ступакевич. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2008. – 86 с.

*2.* Фестивали Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belarus.by/ru/about-belarus/culture/festivals-in-belarus. – Дата доступа: 07.09.2021.


УДК 792.82(476)"196/20":929СавельеваИ.Н.

## ВКЛАД И. Н. САВЕЛЬЕВОЙ В РАЗВИТИЕ БЕЛОРУССКОГО БАЛЕТА


***Н. В. Карчевская,*** *кандидат искусствоведения, доцент, ректор учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*



**Аннотация.** В статье раскрывается вклад выдающейся балерины и педагога Ирины Николаевны Савельевой в развитие белорусской школы балета. Дается краткая характеристика исполнительского творчества И. Н. Савельевой в контексте развития белорусского балетного театра 1960–1970-х гг., определяются основные черты музыкально-пластической эстетики И. Н. Савельевой как педагога, позволившие ей воспитать плеяду балерин, которые стали лидерами разных поколений исполнителей. Впервые в белорусском искусствознании творческая, артистическая и педагогическая деятельность И. Н. Савельевой осмысливается в ракурсе целостного музыкально-пластического, эстетического и компаративного анализа. Научное обобщение творческого наследия И. Н. Савельевой имеет важное историографическое значение, поскольку деятельность мастера является неотъемлемой частью общей летописи белорусского хореографического искусства.



**Ключевые слова:** балет, исполнитель, балетный педагог, театрально-хореографическая жизнь, музыкально-пластическое воплощение, движение, комбинация движений, урок классического танца.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ